**НАСТАССЯ ДАНІЛОВІЧ** – кандыдат мастацтвазнаўства, метадыст кабінета традыцыйных музычных культур Установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі», навуковы супрацоўнік Дзяржаўнай навуковай ўстановы «Цэнтр даследаванняў культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

**Купальскія напевы на Заходнім Палессі: па слядах артыкула К. Машыньскага «Zwyczaje świętojańskie na zachodniem Polesiu»**

Да разгляду купальскіх напеваў Заходняга Палесся ў этнаграфічным кантэксце падштурхнуў пераклад у беларускую мову артыкула К. Машыньскага “Zwyczaje świętojańskie na zachodniem Polesiu”, створанага на аснове мэтанакіраваных апытанняў у 1927 годзе настаўнікамі мясцовых жыхароў амаль 80 вёсак тагачасных Бельскага, Драгічынскага, Кашырскага, Кобрынскага, Любамльскага і Пружанскага паветаў (карта абследавання: https://goo.gl/maps/rAHwxLBMvjS2). Звесткі пра купальскія абрадавыя дзеянні былі запісаны ў 23 з гэтых вёсак (пераважна Драгічынскага, Кобрынскага і Пружанскага паветаў), толькі ў 4 з іх – тэксты купальскіх песень (вёскі Дабучын, Вугляны Пружанскага, Леснікі з наваколлем Драгічынскага, Вулька Хрыпска Любамльскага паветаў).

Матэрыялам для этнамузыкалагічнага даследавання паслужылі аўдыязапісы купальскіх узораў і этнаграфічных расказаў пра купальскія абрадавыя дзеянні, зробленыя ў экспедыцыях Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі 1980–2010-х гадоў у Бярозаўскі, Ганцавіцкі, Драгічынскі, Івацэвіцкі, Лунінецкі, Ляхавіцкі, Маларыцкі, Пінскі, Пружанскі раёны Брэсцкай вобласці, а таксама нотныя прыклады з песенных збораў ХХ – пачатку ХХІ ст. (запісы Р. Шырмы, З. Мажэйка, Т. Варфаламеевай, У. Раговіча і інш.).

У выніку аналізу складзена карта фіксацый купальскіх песенных узораў на Заходнім Палессі, вызначаны арэалы стуктурна-рытмавых разнавіднасцей купальскіх напеваў, прыналежных да І купальскага, паводле класіфікацыі Г. Таўлай, тыпу. Выяўлена, што

– напевы з 8-складовай (5+3) будовай вepisode вершарадка ў варыянтах музычна-рытмавага “распявання” 11112 112 распаўсюджаны на Выганаўскім Палессі; 11121 112 – на Сярэднім Пашчар’і і, кропкава, Верхнім Над’ясельдзі;

– напевы з 9-складовай (5+4) будовай вершарадка ў варыянтах 11112 1212 прадстаўлены ў локусе Белага, Чорнага і Спораўскага азёр; 11121 1212 – пераважна на Пінска-Лунінецкіх тэрыторыях і ў локусе Белага, Чорнага і Спораўскага азёр, кропкава на Верхнім Над’ясельдзі, а таксама ў наваколлях Маларыты. У аснове ладаінтанацыйнага комплексу пераважнай большасці купальскіх напеваў Заходняга Палесся ляжыць тэрцыя (малая, нейтральная, радзей – вялікая) з субквартай і / або з субсекундай.